Министерство спорта и туризма Республики Беларусь

Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь

Фонд «Дирекция II Европейских игр 2019 года»

Учреждение образования
«Белорусский государственный университет физической культуры»

# II Европейские игры – 2019: психолого-педагогические и медико-биологические аспекты подготовки спортсменов

Материалы Международной научно-практической конференции

4–5 апреля 2019 г.

В четырех частях

Часть 4

Минск
БГУФК
2019

УДК 769.093.1(4)(06)+796.01:159.9+796.015
ББК 75.4ф+75.0
В87

*Рекомендовано к изданию редакционно-издательским советом БГУФК*

Редакционная коллегия:
*Репкин С.Б.*, д-р экон. наук, доцент (гл. редактор);
*Морозевич-Шилюк Т.А.*, канд. пед. наук, доцент (зам. гл. редактора);
*Буйко Т.Н.*, д-р филос. наук, доцент;
*Иванченко Е.И.*, д-р пед. наук, профессор;
*Кобринский М.Е.*, д-р пед. наук, профессор;
*Михеев А.А.*, д-р пед. наук, д-р биол. наук, доцент;
*Фурманов А.Г.*, д-р пед. наук, профессор;
*Юшкевич Т.П.*, д-р пед. наук, профессор

**II Европейские** игры – 2019: психолого-педагогические и медико-био-
В87 логические аспекты подготовки спортсменов : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 4–5 апр. 2019 г. : в 4 ч. / Белорус. гос. ун-т физ. культуры ; редкол. : С. Б. Репкин (гл. ред.), Т. А. Морозевич-Шилюк (зам. гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУФК, 2019. – Ч. 4. – 423 с.
ISBN 978-985-569-337-7 (ч. 4).
ISBN 978-985-569-332-2.

Издание представляет собой сборник статей Международной научно-практической конференции «II Европейские игры – 2019: психолого-педагогические и медико-биологические аспекты подготовки спортсменов».

В четвертой части сборника представлены направления «Олимпийское образование», «Современные системы и пути развития непрерывного профессионального образования в области физической культуры, спорта и туризма», а также «Проблемы спорта и физического воспитания глазами молодых (исследования аспирантов, магистрантов, студентов)», где отражены вопросы, затрагивающие актуальные проблемы научно-методического сопровождения подготовки спортсменов высокого класса и резерва.

Издание предназначено для специалистов отрасли «Физическая культура, спорт и туризм», преподавателей, научных работников, аспирантов и студентов.

**УДК 769.093.1(4)(06)+796.01:159.9+796.015**
**ББК 75.4ф+75.0**

**ISBN 978-985-569-337-7 (ч. 4)**
**ISBN 978-985-569-332-2**
© Учреждение образования «Белорусский государственный университет физической культуры», 2019

УДК 796.032:341.1-057.177.1

*Люкевіч Ул.П.*
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
Рэспубліка Беларусь, Брэст

## ПРЭЗІДЭНТЫ МАК. АД ДЭМЕТРЫЮСА ВІКЕЛАСА ДА ЭЙВЭРЫ БРАНДЫДЖА: ТАКТЫКА І СТРАТЭГІЯ КІРАВАННЯ

*Lukievič Uł.P.*
A.S. Pushkin Brest State University
Republic of Belarus, Brest

## IOC'S PRESIDENTS. FROM DEMETRIUS VIKELAS TO AVERY BRUNDAGE: TACTICS AND STRATEGY OF MANAGEMENT

ABSTRACT. This material focuses on the choice of tactics and strategy in the activities of top management of the International Olympic Committee in the period up to 1972. Contradictions in the development of the world socio-economic order influenced the choice of a number of preferences in the Olympic movement formation. The IOC Presidents had to take into account a variety of factors in order to prevent unjustified decisions, although this was not always possible. The practical activity of the IOC representatives of our time for the most part takes into account the leadership tactics and strategy of their predecessors.
KEYWORDS: IOC; Olympic Charter; IOC Presidents; management tactics; management strategy.

АНАТАЦЫЯ. У дадзеным матэрыяле ўвага акцэнтуецца на выбары тактыкі і стратэгіі кіравання ў дзейнасці вышэйшых органаў Міжнароднага алімпійскага камітэту ў перыяд да 1972 года. Супярэчнасці ў развіцці сусветнага сацыяльна-эканамічнага парадку паўплывалі на прыняцце шэрагу самых разнастайных рашэнняў дзеля падтрымкі станаўлення алімпійскага руху. Прэзідэнты МАК павінны былі ўлічваць мноства розных фактараў, каб не зрабіць недапушчальных памылак, хоць гэта ўдавалася далёка не заўсёды. Практычная дзейнасць прадстаўнікоў МАК сучаснасці ў пераважнай большасці выпадкаў улічвае тактыку і стратэгію кіравання сваіх папярэднікаў.
КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: МАК; Алімпійская хартыя; прэзідэнт МАК; тактычны менеджмент; стратэгічны менеджмент.

Міжнародны алімпійскі камітэт з самага пачатку свайго існавання (1894 год) у высокай ступені ўлічваў тую сацыяльна-эканамічную сітуацыю, якая існавала ў грамадстве. Ягонае кіраўніцтва спрабавала і да сённяшняга часу спрабуе ўстрымацца ад умяшальніцтва ў палітычныя справы, але ў розныя перыяды свайго функцыянавання МАК быў змушаны да самых разнастайных кампрамісаў. Такая тактыка зыходзіла перш за ўсё з падставовых прынцыпаў Алімпійскай хартыі: спорт функцыянуе ў межах грамадства і спартыўныя арганізацыі ў сістэме алімпійскага руху павінны захоўваць палітычны нейтралітэт [1]. Акрамя таго ў рэдакцыі Алімпійскай хартыі, якая была прынятая 09 кастрычніка 2018 года, зроблены моцны акцэнт адносна забеспячэння адсутнасці ўсялякай формы дыскрымінацыі: расавага, моўнага, рэлігійнага,

палітычнага характару, па прыкмеце колеру скуры, палавой прыналежнасці, сексуальнай арыентацыі, наяўнасці іншай думкі, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, валодання маёмасцю, нараджэння альбо іншага статусу [1]. Прэзідэнты МАК з розным поспехам спрабавалі ўтрымаць сваю арганізацыю ў якасці надурадавага і наддзяржаўнага суб’екта дзейнасці.

Першы прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэту бізнэсмен і пісьменнік Дэметрыюс Вікелас (*Demetrios Vikelas,* гады кіравання 1894–1896) займаў свой пост вельмі кароткі перыяд. Яго напэўна можна назваць “нечаканым прэзідэнтам”, але ён выканаў галоўную місію, якая заключалася ў тым, каб паспяхова правесці спаборніцтвы адраджэння старажытных Алімпіядаў, што і адбылося ў 1896 годзе на яго радзіме ў Афінах. У постаці Дэметрыюса Вікеласа дзіўным чынам спалучылася некалькі важных характарных асаблівасцяў, якія разам з ягонай энэргіяй і арганізатарскімі здольнасцямі рэалізаваліся ў актыўнай дзейнасці пад час падрыхтоўкі і правядзення Алімпійскіх гульняў. Як сапраўдны патрыёт сваёй краіны, ён усяляк падтрымліваў старажытнагрэцкую культурную традыцыю, а ў якасці прэзідэнта МАК садзейнічаў яе рапаўсюджванню на сучасныя Алімпійскія гульні, што асабліва яскрава праявілася пад час гістарычнага Алімпійскага кангрэсу 1894 года ў Парыжы [2].

Французкі грамадскі дзеяч і педагог барон П’ер дэ Кубертэн (Pierre de Coubertin, гады кіравання 1896–1925) фактычна з’яўляецца агульнапрызнаным ініцыятарам адраджэння алімпійскага руху ў сучасны перыяд. Менавіта ён генераваў падставовыя ідэі развіцця алімпізму. П’ер дэ Кубертэн вызначаўся нязвыклымі арганізатарскімі здольнацямі. Ён прыцягнуў на свой бок шэраг уплывовых еўрапейскіх палітыкаў і грамадскіх дзеячоў, набыў прыхільнікаў і паслядоўнікаў у розных краінах [3]. Ягонае разуменне паняцця “алімпійская ідэя”, якое будавалася на падставе гуманістычных традыцыяў, да сённяшняга дня з’яўляецца адным з найважнейшых прынцыпаў дзейнасці ў сучасным спорце [3]. 1нтэрпрэтацыя спадчыны культуры Старажытнай Грэцыі адносна феномену алімпізма спрыяла фарміраванню, развіццю, функцыянаванню і распаўсюджванню спорту па ўсім свеце. Аднак у варунках глабалізаванага грамадства рамантычнае і сентыментальнае трактаванне спорту з пункту гледжання ідэялістычнага яго ўспрымання П’ерам дэ Кубертэнам усё больш і больш падпадае пад ціск бязлітасных камерцыялізацыйных працэсаў нашага часу [3].

У складаных сацыяльна-эканамічных умовах праходзіла дзейнасць трэцяга прэзідэнта МАК бельгійскага графа Анры дэ Байле-Лятура (Henri de Baillet-Latour, гады кіравання 1925–1942), які зрабіў шмат намаганняў у справе развіцця алімпійскага руху. Хоць з іншага боку ягоная праца характарызуецца як шэраг супярэчлівых крокаў, ён абвінавачваецца ў цесным супрацоўніцтве з кіраўніцтвам нацысцкай Германіі і падтрымцы нацысцкай ідэялогіі [4]. У якасці замены кубертэнаўскіх сантыментаў адносна аматарства ў спорце жорсткая сацыяльная рэчаіснасць прапанавала прафесіянальныя падставы ў рэалізацыі гэтага феномену. Канфрантацыя паміж аматарамі і прафесіяналамі на некалькі дзесяцігоддзяў запаволіла развіццё алімпійскага руху, а каб не дапусціць прафесіяналаў да ўдзелу ў Алімпіядах, у Алімпійскую хартыю было уведзена так званае правіла 26 [5]. Байле-Лятур быў змушаны да тактыкі лавіравання ў 30-я гады мінулага стагоддзя з мэтаю захавання алімпійскага руху. Вельмі неадназначным з пункту гледжання сённяшняга дня падаецца таксама рашэнне аб правядзенні XI Алімпійскіх гульняў 1936 года ў Берліне. Але адным з галоўных паказальнікаў ягонай працы з’яўляецца тое, што алімпійскі рух не занепадаў і традыцыя правядзення Алімпіядаў не перапынілася.

Неадназначнасць развіцця сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў свеце не магла не адбіцца на дзейнасці чарговага прэзідэнта МАК, шведскага прамыслоўца Зігфрыда Эдстрама (Sigfrid Edström), які ўзначальваў гэтую арганізацыю з 1942 па 1952 год. З аднаго боку, пад яго кіраўніцтвам удалося захаваць традыцыі пераемства ў Міжнародным алімпійскім камітэце, працягнуць далейшае яго развіццё. Але з другога боку, застаюцца супярэчлівыя пытанні адносна ягоных палітычных поглядаў, выбару тактыкі і стратэгіі ў паступальным пашырэнні алімпійскага руху і захаванню прыналежнасці да алімпійскіх прынцыпаў [6]. Гэта быў таксама час, калі пачаўся перыяд новага палітычнага падзелу свету, калі ўяўныя рысы пачала набываць так званая “халодная вайна”. МАК пад кіраўніцтвам Эдстрама ўпершыню сутыкнуўся з невядомай да гэтай пары з’явай, а менавіта ўдзелам у спаборніцтвах дзвюх нямецкіх дзяржаваў, дзвюх кітайскіх і дзвюх карэйскіх. Акрамя таго ў пасляваенныя гады пачалося складанае і неадназначнае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі СССР. Нельга не адзначыць некаторыя ягоныя асабістыя погляды, якія праявіліся ў падтрымцы правядзення Алімпіяды 1936 года ў Берліне, блізкімі кантактамі з нацысцкімі кіраўнікамі спорту, што працягваліся далей і па заканчэнні Другой сусветнай вайны. Разам з тым генеральная дзейнасць Зігфрыда Эдстрама была накіравана на аднаўленне і замацаванне алімпійскага руху, на выкарыстанне алімпійскай ідэі як фактара развіцця ўзаемапаразумення і супрацоўніцтва паміж народамі.

Чарговы прэзідэнт МАК Эйвэры Брандыдж (Avery Brundage) са Злучаных Штатаў Амерыкі правёў на сваёй пасадзе дваццаць гадоў (1952–1972). Гэта быў выключна цяжкі час у палітычным успрыманні, калі міжнародная супольнасць характарызавалася складанымі ўзаемаадносінамі ў рэальным існаванні дзвюх Германіяў, дзвюх Карэяў, двух Кітаяў, калі ў спорце актуальнай была праблема апартэіду ў Паўднёвай Афрыцы і Радэзіі, калі сталі наспяваць няўхільныя тэндэнцыі прафесіяналізацыі алімпійскага спорту, калі сродкі масавай інфармацыі даводзілі пра палітычныя дэманстрацыі амерыканскіх чарнаскурых атлетаў, і, нарэшце, забойства адзінаццаці ізраільскіх спартоўцаў непасрэдна пад час правядзення Алімпійскіх гульняў 1972 года ў Мюнхене. Усе гэтыя праблемы адна за другой абрынуліся на Эйвэры Брандыджа, і той прымаў рашэнні выключна самастойна, таму што з аднаго боку, быў прыхільнікам аўтакратычнага стылю кіравання, а з другога, у яго адсутнічалі дыпламатычныя навыкі, каб знайсці шляхі да кампрамісу. Таксама на шэраг рашэнняў прэзідэнта МАК паўплывала тое што ён знаходзіўся ў палоне ідэялістычных поглядаў сваіх папярэднікаў і не змог адэкватна ацаніць усе тыя змяненні якія тады сталі імкліва адбывацца па ўсім свеце [7]. Адной з праблемных супярэчнасцяў мінулага часу выявілася тое, што спорт вызначальна і першапачаткова трактаваўся па-за палітыкай, а сацыяльная рэальнасць дэманстравала зусім іншыя тэндэнцыі, якія штораз набывалі новыя імпульсы ў сваім развіцці.

Кароткі аналіз дзейнасці першых пяці прэзідэнтаў Міжнароднага алімпійскага камітэту ў выбары тактыкі і стратэгіі кіравання ў галіне спорту паказвае на часам супярэчлівыя падыходы ў вырашэнні вялікай колькасці пытанняў. Калі на пачатку Дэметрыюс Вікелас і П’ер дэ Кубертэн грунтуюцца пераважна на пазіцыях рамантызму і сентыменталізму з пэўнай доляй гістарычнай настальгіі, то далей на разгортванне падзеяў у вялікай ступені пачынаюць уплываць сацыяльна-палітычныя фактары. Характэрнымі прыкметамі такога становішча становіцца канфрантацыя свету і асобных краінаў па шэрагу разнастайных крытэрыяў. Знакамітае кубертэнаўскае выказванне “О спорт, ты – мір!” ва ўсё большай ступені пачынае трактавацца як вайна без зброі.

1. Olympic Charter. – Lausanne: Published by the International Olympic Committee, 2018. – 99 p.
2. Люкевіч, Ул. П. Прэзідэнты МАК. Дэметрыюс Вікелас: асветнік і літаратар / Ул. П. Люкевіч // Гульні і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: выклікі і перасцярогі: зб. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна [і інш.]; рэдкал.: Ул. П. Люкевіч [і інш.]. – Брэст: Альтэрнатыва, 2015. – С. 5–9.
3. Люкевіч, Ул. П. Прэзідэнты МАК. П'ер дэ Кубертэн: алімпійская ідэя / Ул. П. Люкевіч // Гульні і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: змены сацыяльнай парадыгмы: зб. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; рэдкал.: Ул. П. Люкевіч (старш.) [і інш.]. – Брэст: БрДУ, 2017. – С. 3–8.
4. Люкевіч, Ул. П. Прэзідэнты МАК. Анры дэ Байле-Лятур: небяспека алимпийскага крызису / Ул. П. Люкевіч // Теоретические и прикладные аспекты олипийского образования, физической культуры и спорта школьников и учащейся молодёжи : сб. науч. ст. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина, Упр. спорта и туризма Брест. облисполкома; под общ. ред. А. А. Зданевича. – Брест: БрГУ, 2017. – С. 80–85.
5. Олимпийская хартия. – М.: Международный олимпийский комитет; Олимпийский комитет СССР; Олимпийская академия СССР, 1990. – 87 с.
6. Люкевіч, Ул. П. Прэзідэнты МАК. Зігфрыд Эдстрам: алімпійскі рух па заканчэнні Другой сусветнай вайны / Ул. П. Люкевіч // Актуальные проблемы теории и методики физического воспитания и спортивной тренировки: материалы Респ. науч.-практ. конф., Брест, 20–21 апр. 2018 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина; редкол.: И. Ю. Михута, К. И. Белый, С. К. Якубович. – Брест: БрГУ, 2018. – С. 34–38.
7. Люкевіч, Ул. П. Алімпійскі рух у эпоху "халоднай вайны" / Ул. П. Люкевіч // Актуальные проблемы физической культуры и спорта школьников и учащейся молодежи: сб. науч. ст. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина, Упр. спорта и туризма Брест. облисполкома; под общ. ред. А. А. Зданевича. – Брест: БрГУ, 2018. – С. 68–72.

**УДК 796/799**

***Люлина Е.,***
***Арсланов Ш.***
Узбекский государственный университет физической культуры и спорта
Республика Узбекистан, Чирчик

## ОЛИМПИЙСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В ДЕЛЕ ФОРМИРОВАНИЯ ЗДОРОВОГО ОБРАЗА ЖИЗНИ

***Lyulina E.,***
***Arslanov Sh.***
Uzbek State University of Physical Culture and Sport
Republic of Uzbekistan, Chirchik

## OLYMPIC EDUCATION AND HEALTHY LIFESTYLE

ABSTRACT. Potential value of Olympism in healthy lifestyle formation is considered in the article. A brief overview of practical implementation of the Olympic education in the Republic of Uzbekistan is presented.